# Добры дзень, дарагія сябры

Гэта пісьмо я пішу вам яшчэ з адной вельмі цяжкай і горкай нагоды. У красавіку мне вярнулі з Альшова пісьмо, якое я пасылаў сваёй дваюраднай сястры (нашы маці былі сёстрамі). Ганне Еўдакімаўне Барабанавай (прозвішча па мужу). А мне вярнула пошта гэта пісьмо з надпісам: «Адрасат памёр». Я проста быў разбіты напавал гэтай весткай. Яшчэ нядаўна сустракаўся з сястрой, сядзеў разам з ёй за сталом, у роднай вёсцы. І вось яе няма. Упала апошняя пялёстка з нашага сямейнага дрэва. Цяпер у мяне ў маёй роднай вёсцы не засталося нікога з родзічаў.

Пад уражаннем перажытага гора і напісаўся гэты верш, «Матчына сукенка», які я пасылаю вам і прашу надрукаваць у паважанай вашай газеце.

Ваш Пятро ПРЫХОДЗЬКА.

---

## МАТЧЫНА СУКЕНКА

Памяці сваёй сястры
Ганны Еўдакімаўны Барабанавай.

Сястры сваёй ліст пасылаў я
У родную вёску Альшоў.
Ці ведаў, што ён з-пад Заслаўя
Туды ў небыццё ўжо ішоў?
Пісаў я сардэчна, прачула,
Пра ўсё ёй як сябар і брат.
А пошта пісьмо мне вярнула —
І надпіс: «Памёр адрасат!..».
Не можа бацькоўская вёска
Стрымаць сёння жалю свайго:
Апошняя ўпала пялёстка
З сямейнага дрэва майго.
У хаце свяча дагарае,
Як іскарка ў дыме кастра.
Ляжыць у труне дарагая,
Старэйшая з роду сястра.
Не чуе ні плачу, ні енку
Яна пад жалобную медзь...
А матчыну ж нехта сукенку
Паспеў ёй прад смерцю адзець.
Я ведаю — надта любіла
Вось гэту сукенку, што шыла
І ткала ёй маці сама.
Я помню сястру маладою,
Калі ў позні вечар сівы
Пад вэлюмам стройнай хадою
Йшла з Маркам сваім да царквы.
У спеласці жытняга лета
Цвіла прыгажосцю сваёй.
З сувою сукенка вось гэта
Вясёлкаю ззяла на ёй.
Дзяўчаты адну знаці моду,
Насілі сукенкі яны,
Якія дарылі ад роду
Ім нашы з блакіту ільны...
Пагас у вясковым акенцы
Апошняй пялёстачкі цвет.
У матчынай сіняй сукенцы
Дачка адыйшла ў іншы свет...
Ды я з гэтай весткай балючай
Змірыцца ніяк не магу.
І памяць жывіцай гаючай
Я ў сэрцы сваім зберагу.

---

На здымку: Пятро Прыходзька са сваёй сястрой Ганнай Еўдакімаўнай Барабанавай у Альшове

З маленства яна нездарма (1988 г.).



**Прыходзька, П. Добры дзень, дарагія сябры** : [пісьмо ў рэдакцыю з вершам «Матчына сукенка»] / Пятро Прыходзька // Шлях Кастрычніка. — 1989. — 15 лютага. — С.4.